в оптимальном состоянии данных мест способствует национальный туристический продукт, основой популярности которого является востребованное, живое и достойное историко-культурное наследие. Не более двух десятков памятников из наиболее известных объектов культурно-исторического наследия Беларуси находятся в достойном состоянии и популярны как объекты туризма. Возрождение интереса к региональным культурно-историческим объектам как основы региональной идентификации будет способствовать не только устойчивому развитию региона, но и поддержанию национального самосознания белорусов.

**Список цитируемых источников**

1 Балибар Э , Валлерстайн И Раса, нация, класс Двусмысленные идентичности М Логос-Альтера Ecce Homo, 2003
2. Хюбнер К Нация: от забвения к возрождению М Канон+, 2001
3. Геллнер Э Нации и национализм М Прогресс, 1991
4 Кодина И Н Региональная идентичность как ресурс развития туристической привлекательности территории // Беларусь в современном мире: материалы XI Междунар. конф , посвящ 91-летию образования Белорус гос ун-та, 30 окт 2012 г / редкол В Г Шадурский [и др ]. Минск Изд центр БГУ, 2012
5 Середа В В «Львовянин» — отдельная идентичность или место прописки? [Электронный ресурс] URL http //zaxid net/news/showNews do?lvovyanin__otdelnaya_identichnost_ili_mesto_propiski&objectId=1191379 (дата обращения 23.02.2015)

**УДК 008.161.3**

**В. І. Вярбіцкая, А. І. Смолік**
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск

## ЭТНІЧНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ ЯК ДАМІНАНТА ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЫ ЯКУБА КОЛАСА

Літаратура як культурны тэкст утрымлівае ў сабе сацыякультурны досвед народа, захоўвае яго, ажыццяўляе кадзіраванне і передачу наступным пакаленням. Па меркаванню Р. Барта і Ю. Крысцевай даследаванне літаратурнага тэксту павінна абапірацца на структурна-семіятычны метад, які дазваляе рэканструяваць тэксты з шырокім культурным кантэкстам. Сутнасць яго зводзіцца да разгляду культуры з пункту гледжання яе знакавасці, спецыфічных характарыстык працэсаў азначэння і разумення культурна значнай інфармацыі, якая замацавана ў культурных тэкстах. Так, Р. Барт адзначаў, што тэкст патрабуе, каб мы імкнуліся да скарачэння дыстанцыі паміж пісьмом і чытаннем, не акцэнтавалі ўвагу асобы чытача на твор, а аб'ядноўвалі чытанне і пісьмо ў адзінай знакавай дзейнасці [1, с. 420]. Ю. Крысцева прапанавала трактаваць тэкст як форму дыскурсу і цэласную функцыянальную структуру, адкрытую для мноства сэнсаў, якія існуюць у сістэме сацыяльных камунікацый. У выніку такой інтэрпрэтацыі тэкст паўстае ў адзінстве яўных і неяўных, невербалізаваных значэнняў, літаральных і другарадных, схаваных сэнсаў [2]. Бо, як пісаў А. Шапенгаўэр, цалкам нас задавальняе твор толькі ў тым выпадку, калі ён пакідае ў нашай душы такое ўражанне, якое мы, колькі б аб ім не разважалі, не можам цалкам давесці да выразнасці паняцця [3, с. 522]. На падставе вышэй сказанага творчую спадчыну таленавітага беларускага паэта, празаіка, драматурга, публіцыста, перакладчыка Якуба Коласа (1882—1956) можна разглядаць як багаты і разнастайны набор тэкстаў, якія ўяўляюць сабой адкрытую знакавую сістэму, што утварае шырокі спектр разнастайных прачытанняў. Яна складаецца з мастацкіх твораў, навуковых прац, публіцыстыкі, перакладаў, асабістай карэспандэнцыі.

Адным са змястоўна-тэматычных вузлоў творчасці пісьменніка была праблема этнічнайнай ідэнтычнасці,пад якой маецца на ўвазе вынік эмацыянальна-кагнітыўнага працэсу асэнсавання этнічнай прыналежнасці, атаясамлівання індывідам сябе з прадстаўнікамі свайго этнасу і адасабленне ад іншых этнасаў. У выніку спецыфікі гістарычнага развіцця беларускага этнасу да канца XIX стагоддзя, лічыў Я. Колас, народ і нават большая частка інтэлігенцыі мелі няяркі, невыразны і неакрэслены светапогляд, неразвітую этнанацыянальную ідэнтычнасць. Ва ўяўленні прадстаўнікоў еўрапейскай супольнасці беларусы паўставалі як нявызначаная маса без этнічнай свядомасці і сваёй нацыянальнай ідэі. Адносіны да беларускасці з боку еўрапейцаў Колас скандэнсавана паказаў у паэме «Рыбакова хата». Прадстаўнік польскай адміністрацыі ў Заходняй Беларусі пан Пшэбора, адзін з персанажаў паэмы, выказаў тыпічнае тагачаснае меркаванне аб беларускасці наступнымі словамі: «Што беларускасць? пыл і дым, / І засмучацца няма чым: / Няма ў культуры іх карэння» [4, с. 33]. Эмацыянальна і безапеляцыйна фармулюе Колас крыўдны для яго факт культурнай непамятнасці ў трылогіі «На ростанях». Галоўны герой твора, Андрэй Лабановіч у спрэчцы са сваім калегам Турсевічам з горыччу разважае: «Кожны народ мае свой гонар. Англічанін перад усім светам горда зазначае: я — англічанін! Тое самае скажа француз, немец, аўстрыец, рускі і іншыя прадстаўнікі другіх нацый. А мы, беларусы, не адважваемся

© Вярбіцкая В І , Смолік А І , 2015

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

прызнацца ў тым, што мы — беларусы». [5, с. 82]. У сувязі з гэтым Я. Колас усведамляў неабходнасць фарміраваць рэпрэзентатыўна-кананічны ідэал беларускага народа, спалучаны з вераю ў праўду, у заўтрашні дзень, у высокія ідэалы жыцця. Трэба было развеяць думку аб спрадвечнай культурнай адсталасці беларускага народа, аб яго няздольнасці да самастойнага этнанацыянальнага развіцця.

У шэрагу публіцыстычных артыкулаў і мастацкіх твораў пісьменніка выразна прасочваецца праблема асэнсавання ролі культурнай памяці і забыцця як у кантэксце культурнай цэласнасці, так і ў актуальным быцці канкрэтнай асобы. Паводле Я. Асмана, культурная памяць — гэта спецыфічная для кожнай культуры форма перадачы і актуалізацыі культурных сэнсаў, якія накіроўваюць учынкі і перажыванні ў спецыфічныя рамкі ўзаемадзеяння ўнутры пэўнага грамадства і падлягаюць настаўленню і паўтарэнню з пакалення ў пакаленне [6, с. 86]. Я. Колас лічыў, што беларускі народ, дасягнуўшы ў пачатку XX стагоддзя пэўнага ўзроўню свайго культурна-гістарычнага развіцця і этнічнай самасвядомасці, пачаў усведамляць важнасць сваёй гісторыі, веданне якой неабходна захаваць і перадаць наступным пакаленням. Таму мнеманічная аксіялогія культуры літаральна пранізвае коласаўскія тэксты. Адным са стымулюючых пачаткаў у актыўнай распрацоўцы Коласам тэмы культурнай памяці стала асэнсаванне мінулага ў кантэксце адраджэння беларускай нацыянальнай культуры і дзяржаўнасці. Культуралагічны аналіз коласаўскіх тэкстаў паказвае, што этнанацыянальную гісторыю пісьменнік трактаваў пераважна як спецыфічную форму культурнай памяці, адэкватную задачам фарміравання маштабных ідэнтычнасцей ва ўмовах дзяржаўнага адраджэння. Публіцыстычныя і мастацкія коласаўскія тэксты пранізаны гістарызмам. У шэрагу твораў пісьменнік узнаўляў у памяці беларусаў важнейшыя этапы гістарычнага развіцця нашай краіны. Ён імкнуўся абазначыць спрадвечнасць, старажытнасць беларускага народа, яго дзяржаўнасці і культуры. У артыкуле «Шануйце і любіце сваю родную мову» пісьменнік адзначаў, што «беларускі народ, як і кожны народ, мае сваю багатую гісторыю…» [7, с. 25]. У артыкуле «Двадцать пять» ім раскрываецца сутнасць гісторыі беларускага народа: шматвяковая барацьба супраць сацыяльнай няспраўядлівасці, прыгнятальнікаў, чужаземных захопнікаў.

У аснове коласаўскай парадыгмы этнічнай ідэнтыфікацыі ляжыць прынцып усебаковага развіцця беларускай мовы як ядра культуры, заваявання ёю месца ў сусветнай супольнасці. На думку Коласа, беларуская мова, як і мова кожнага народа, утрымлівае ў сабе сваю этнанацыянальную самабытную класіфікацыйную сістэму, якая вызначае светаадчуванне этнаса і фарміруе яго карціну свету. «Скрозь адчыненыя дзверы роднай мовы, — зазначаў творца у сваёй працы "Методыка роднае мовы", — льецца ў школу шырокая, магутная плынь, плынь асветы, людкуючы розум і пачуцці дзяцей» [8]. Пісьменнік сцвярджаў, што мова народа з'яўляецца важнейшай формай этнічнай ідэнтыфікацыі, тым моцным падмуркам, на якім можа паўстаць нацыянальная ідэалогія. Гэты пункт гледжання адпавядае выказванням вядомых еўрапейскіх філосафаў Г. Гадамера [9] і М. Хайдэгера, якія разглядалі мову як « дом нашага духоўнага быцця», «асяроддзе, у якім існуе чалавек з яго культурай» [10, с. 14]. У артыкулах «Шануйце і любіце сваю родную мову», «Что было и что стало», «Думкі да дваццаціголдзя» і іншых пісьменнік вызначае месца і ролю роднай мовы ў інтэграцыі беларускага грамадства. Мова, па меркаванні Я. Коласа, уяўляе сабой галоўную форму выражэння і існавання нацыянальнай культуры, выступае як сродак рэалізацыі ўнутранай формы выражэння культуры [11]. У яго творчай спадчыне мова выступае як універсальная форма асэнсавання рэальнасці, у якую арганізуюцца ўсе узніклыя або ўжо існуючыя ўяўленні, апэрцэпцыі, панящці, вобразы і іншыя сэнсавыя канструкцыі (носьбіты сэнсу). Мова, на думку Коласа, з'яўляючыся «праблемай сэнсу культуры», сінтэзуе сацыяльныя, культурна-гістарычныя, псіхалагічныя, эстэтычныя аспекты жыцця беларускага народа.

Важнейшым тэзісам коласаўскай канцэпцыі ідэнтычнасці з'яўляецца думка аб выключнай ролі этнічнай культуры ў фарміраванні самасвядомасці асобы. Аб тым, што этнічная культура з'яўляецца ўстойлівай часткай нацыянальнай культуры, дзякуючы якой адбываецца назапашванне і трансляцыя народнага вопыту ў гісторыі, Колас пісаў у артыкулах «Янка Купала і паэзія», «Двадцать пять», «Что было, что стало», «Культура і навука ў БССР за 30 год», «Вялікі друг народа», «Быть гражданином» і інш. Культурная самабытнасць беларусаў асацыіравалася ў Я. Коласа з фальклорам, які стагодзямі выпрацоўваў свой нацыянальны стыль. Ён лічыў, што засваенне вуснай творчасці народа — першасная ўмова ідэнтыфікацыі асобы. У артыкуле «Шануйце і любіце сваю родную мову» паэт заклікаў моладзь «ведаць свой народ, яго гісторыю, яго багатую вусную творчасць» [12]. Аналагічныя задачы вылучае Колас перад літаратарамі, кампазітарамі, дзеячамі мастацтва і кіраўніцтвм дзяржавы ў артыкулах «Культура і навука ў БССР за 30 год», «Быть гражданином», «Что было, что стало». Этнанацыянальная культура не можа існаваць без традыцыі, бо яна абапіраецца на гістарычную памяць і калектыўны досвед як дыялектычную аснову грамадскага развіцця. Звяртаючыся да літаратурнай моладзі, Я. Колас пісаў: «Мы маем вялікі, моцны запас, які незаслужана забыты намі, літаратарамі, і з поспехам ужываецца ў народзе» [13].

Паняцце «беларус» у Я. Коласа асацыіравалася з вобразам селяніна. Важнейшым маркёрам ідэнтычнасці беларуса, па меркаванню паэта, выступае шматвяковая мараль, якой кіруюцца вяскоўцы ў сваім паўсядзённым жыцці. Маральна-этычныя праблемы найбольш выпукла адлюстроўваюцца пісьменнікам у навелах, якія сабраны пад назвай «Казкі жыцця», паэмах «Новая зямля», «Рыбакова

хата». У іх аналізуецца складанасць, супярэчлівасць вясковага жыцця, відавочная непадзельнасць, злучнасць дабра і зла, вечнасць чалавечага імкнення да шчасця. Колас у сваіх творах імкнецца засяродзіць увагу на душэўнай дабраце народа, на ўласцівым яму пачуцці справядлівасці. Добрае творца шукае ў звычайным чалавечым характары. Так, альтруізм Антося праяўляецца перш за ўсё ў тым, што ён умее ахвяраваць сабой, жыць дзеля іншых, і не толькі дзеля блізкіх, якімі з'яўляюцца брат, яго жонка і дзеці, а і дзеля тых жа, скажам, вяскоўцаў: "За дзядзьку людзі просяць бога: / Каму ён толькі не спрыяе, / Каго з бяды не вызваляе!" [14, с. 138]. Чалавечыя пачуцці праяўляе да Данілы і Марыны рыбак Сымон Латушка, які аддае ім сваю хату. Душа і сэрца коласаўскіх герояў адкрытыя, каб прыкмячаць, заўважаць у жыцці добрае і пашыраць, узбагачаць такім чынам уласны жыццёвы вопыт. Коласаўскім героям уласціва любоў да ўсяго жывога, вера ў дабро і ў людзей, уменне лёгка пераносіць жыццёвыя нягоды, душэўная непасрэднасць, праўдзівасць.

Неад'емнай рысай сяляніна як суб'екта беларускай этнічнай культуры, лічыў Я. Колас, з'яўляецца цярплівасць, тая спрадвечная цягавітасць, што абумовіла вытокі гістарычнага народнага аптымізму, жыццесвярджальнасці. Так, Міхал прагна, з цярпеннем шукае вызвалення з-пад панскай улады. Усё ў ім падпарадкавана імкненню набыць зямлю, вырвацца з лесніковай пасады. Дзеля сваёй жыццёвай задачы Міхал гатовы цярпець часовае прыніжэнне, зносіць насмешкі, кпіны: «Але ні злосць твая, ні слёзы, / Ні моцна шчэмлены кулак / Не зменяць справы аніяк 0151 / Цярпі! Чаму? Дакуль цярпенне? / Калі канец яму, рушэнне?» [15]. Але паэт адзначаў, што цярпенне гэта не рабскае. Пад знешняй абалонкай пакорлівасці тоіцца нязломнасць, сацыяльны пратэст, пачуццё ўласнай годнасці, якія дапамагаюць селяніну выстаяць у барацьбе са злом. Суб'ект этнічнай культуры у коласаўскіх творах выступае не як пакутнік, прыніжаная, забітая асоба, а як свабодалюбівы чалавек, які не жадае пакорліва зносіць здзек і прымус.

Разуменне сутнасці працэсаў, якія адбываюцца ў этнанацыянальнай культуры, у многім залежыць ад наяўнасці ў асобы ўласцівасці да накіраванага ўспрымання свету, сфарміраванасці этнічнага светаадчування. Уздзеянне агульнага зместу псіхічнай дзейнасці, жыццёвага вопыту чалавека на ўспрыманне навакольнага асяроддзя, артэфактаў культуры ў філасофіі і псіхалогіі абазначаецца паняццем «аперцэпцыя». У сучаснай культуралогіі пад аперцэпцыяй падразумеваецца ўздзеянне агульнага зместу псіхічнай дзейнасці, усяго папярэдняга вопыту чалавека і яго этнасу на ўспрыманне ім прадметаў і з'яў. Успрыманне сацыякультурнай рэчаіснасці і адчуванне яе адбываецца пад уплывам этнічнай культуры і набору этнічных генатыпаў. Культуралагічны дыскурс у мастацкіх і публіцыстычных творах Я. Коласа, сведчаць, што творчасць пісьменніка па спосабу адлюстравання рэчаіснасці ў многім грунтуецца на прынцыпах этнічнай аперцэпцыі, якая разумеецца як стрыжнёвая накіраванасць успрымання асобай з'яў і працэсаў культуры, выпрацаваны ў выніку мэтазгоднай дзейнасці чалавека, хаця і абумоўленая генетычным кодам этнаса. Формай пазнання чалавека, прыроды, зменлівых сацыякультурных працэсаў у Коласа выступае этнічнае светаадчуванне, поўнае супадзенне, зліццё паэта з дынамічнай, духоўнай сутнасцю свету беларускага этнасу, яго жыццёвым парывам.

На наш погляд, своеасаблівымі кагнітыўнымі ўзорамі, на якіх заснавана коласаўская этнічная аперцэпцыя, з'яўляюцца этнакультурныя архетыпы. Найбольш глыбока ім увасоблены і пераасэнсаваны прасторавыя архетыпы: Зямлі, Сонца, Вады, Балота, Дрэва, Лесу, Агню, Дарогі. Пры аналізе семантыкі коласаўскіх вобразаў можна рэканструяваць старажытныя сэнсы гэтых і іншых архетыпаў і аднначасова знайсці асабіста аўтарскае напаўненне названых вобразаў-архетыпаў Архетыпічнае пераасэнсаванне пісьменнікам чалавека як часткі прыроды патрабавала ад творцы адпаведнага афармлення яе ў статус сацыякультурнай з'явы, які ўзаконіў бы пачуццё ўласнай годнасці як натуральнага права чалавечай душы. У коласаўскай спадчыне гэтыя архетыпы разглядаюцца як асноўны элемент астранамічнага коду традыцыйнай мадэлі свету. Яны ў паэта займаюць ўстойлівы высокі семіятычны статус і адносяцца да вельмі станоўчага полюса аксіялагічнай шкалы.

Асаблівасці светапогляду, характару беларускага этнасу, на наш погляд, садзейнічалі фарміраванню ў якасці этнакультурных архетыпаў вобразы Старца і Музыкі. Культуралагічны аналіз паэтычных і празаічных твораў Я. Коласа дазволіў нам выявіць актуалізацыю паэтам сфарміраваных ў традыцыйнай культуры гэтых вобразаў. Аб шырокай укаранёнасці ў этнакультуры беларусаў архетыпавага вобраза Старца паэт гаварыў у паэме «Рыбакова хата»: у кожнай хаце «Павінен дзед быць на палацях, / Мудрэц з сялянскаю душой». Гэты ўзмоцнены мастаком этнакультурны архетып прысутнічае таксама ў паэмах «Сымон-музыка», «Новая зямля», трылогіі «На ростанях», аповесці «Дрыгва», апавяданнях «Паўлюковы думы», «Крывавы пір»,«З боку жыцця», у навеле «Супраць вады». У іх Колас надзяляе цвярозым прыродным розумам беларуса, у якога ёсць свая філасофія, светаразуменне, свае прынцыпы.

Аналіз коласаўскіх мастацкіх тэкстаў сведчыць аб скразной прысутнасці ў іх архетыпа Музыкі з устойлівым захаваннем асноўных рысаў. Архетыпавы вобраз Музыкі найбольш выразна выступае ў цыкле вершаў «Песні-жальбы»,алегарычнай навеле «Дудар»,казцы «Музыкі», вершы «Дудка» і паэме «Сымон-музыка». Яныпа сваёй мастацка-творчай канцэпцыі зніт аваны з этнічнай самасвядомасцю беларусаў. Паэта, перш за ўсё, цікавяць тыя духоўныя набыткі народа, у якіх выказаны яго філасофскія адносіны да жыцця, прыроды, яго светабачанне і адчуванне. У мастацкіх творах Я. Коласа архетып Музыкі з'яўляецца ўвасабленнем свабоды, справядлівасці, роўнасці, натуральнасці, непрымусовасці. Дадзены архетыпічны вобраз паказаны паэтам як анталагічная аснова маральнасці беларускага народа, якая праяўляецца ў сімвалічных зместах, што маюць энергетычнае напаўненне і дзейнасную прыроду.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Такім чынам, этнічная ідэнтычнасць трактуецца Я. Коласам як вынік ідэнтыфікацыі, працэс самакатэгарызацыі, які дасягаецца індывідам у выніку канструявання вобраза навакольнага свету і свайго месца ў ім. Літаратурныя коласаўскія героі не толькі суадносяць сябе з беларускім народам, але і глыбока перажываюць за стан яго гісторыі, культуры і прадстаўленасці ў сусветнай супольнасці. У якасці крытэрыяў этнічнай ідэнтычнасці паэт вылучае агульнасць паходжання, агульнае гістарычнае мінулае, беларускую мову, традыцыі, рэлігію, любоў да сваёй Радзімы, роднай зямлі, прыроды. На думку Я. Коласа, сродкамі ідэнтыфікацыі трансліруюцца і засвайвоюцца этнічныя стэрэатыпы паводзін, культурныя нормы і каштоўнасці, традыцыі і абрады народа, ажыццяўляецца станаўленне этнічна абумоўленага светапогляду.

## Спіс цытуемых крыніц


1. Барт Р От произведения к тексту // Избранные работы. Семиотика. Поэтика. М. : Прогресс, 1989. С 413—423.
2 Kristeva J Desire in lanquage A semiotic approach to literature and art. NewYork : ArnoPress, 1980 336 p.
3 Шопенгауэр А. Мир как воля и представление в 2 т / пер с нем.; ред Е В. Москвич Минск : Попурри, 1999. Т 2 829 с
4. Колас Я Збор твораў : у 14 т Т 7 Паэмы «Рыбакова хата» і «Суд у лесе», «Адплата». Мінск : Маст літ., 1974. 456 с : іл.
5. Там жа Т. 9. Трылогія «На ростанях». 800 с. : іл.
6 Асман Я. Культурная память Письмо, память о прошлом и политическая идентичность в высоких культурах древности М Языки славян культуры, 2004. 217 с
7 Колас Я Збор твораў. Т. 12. Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы 1947—1956 гг Мінск : Маст. літ., 1976 528 с 8 с укл
8. Там жа С 319.
9. Гадамер Г.-Г. Текст и интерпретация (Из немецко-французских дебатов с участием Ж Деррида, Ф Форгета, М Франка, Г.-Г Гадамера, Й. Грайша, Ф Ларуэлла) // Герменевтика и деконструкция / под ред В Штермайера, Х Франка, Б В Маркова СПб . Алетейя, 1999 С 202—242.
10 Хайдеггер М Язык СПб : Эйдос, 1991 19 с.
11. Колас Я Збор твораў Т 12. С 321
12. Там жа С 26.
13. Там жа С 133.
14 Там жа Т. 6 Паэмы «Новая зямля», «Сымон-музыка» Мінск : Маст літ , 1974 624 с : з іл.
15 Там жа С. 95—96.
16. Карский Е. Ф Беларусы . в 3 т Минск : Беларус. кнігазбор, 2001 Т. 1 Введение в изучение языка и народной словесности 466 с



**УДК 140.8**



**Г. Е. Головницкая, Д. А. Кузьменкова**
Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи


# ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫЙ ПОТЕНЦИАЛ КУЛЬТУРНОЙ ТРАДИЦИИ

Современное человечество столкнулось с проблемами, порождёнными инновационными процессами: то, что называется прогрессом, нарушает не только целостность природной среды (экологический кризис), но и целостность и идентичность человека (антропологический кризис). Основной источник этого разрушения — «информационное перепроизводство». Чем выше избыток поступающей извне общей информации, не находящей эффективного использования, тем выше уровень хаотичности социального поведения, что обусловлено неспособностью человека выстроить систему приоритетов и иерархию ценностей.

В связи с этим одной из важнейших задач, которую должна решать современная система образования, становится задача воспитания человека, способного адаптироваться к быстро меняющейся социальной реальности, напрямую зависящей от поступающей информации. Не случайно в системе высшего образования (в частности, университетском образовании, основной идеей которого является приобщение индивида к универсальному знанию) активно ведётся поиск нового идеала рациональности, позволившего бы преодолеть сложившийся кризис целостности человеческого бытия. Обсуждается проблема создания такой образовательной среды, которая позволит студенту в условиях лавинообразного накопления информации овладеть навыками самостоятельной работы, выработать способность ориентироваться в постоянно обновляющемся информационном поле, сообразуясь с возникающими потребностями. Для современной развивающейся культуры более важной является способность человека рассматривать системы знания, технологии формализованного поведения не столько в инструментальном плане, сколько в плане личностного бытия и развития. Только в этом случае смена самих этих инструментов перестанет носить для индивида драматический характер. Она будет сопряжена не с нарушением или утратой человеком личностной определённости, но лишь со сменой форм его самореализации.

На наш взгляд, для решения данной проблемы необходимо не столько направлять усилия на поиск новых педагогических решений, сколько обратить свой взор в историческое прошлое в целях


© Головницкая Г. Е., Кузьменкова Д. А., 2015





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ